*Рагачова Л.М., дацэнт*

# ПАЗНАВАЛЬНЫ ІНТАРЭС ЯК ФАКТАР СТАНАЎЛЕННЯ ПРАФЕСІЙНАЙ САМАІДЭНТЫФІКАЦЫІ СТУДЭНТАЎ

Сацыяльна-эканамічная перабудова грамадства, прызнанне прыярытэтнасці развіцця рыначных адносін стварылі прынцыпова новую сітуацыю ў распрацоўцы і ажыццяўленні тэорыі і практыкі падрыхтоўкі кадравага патэнцыялу для ўсіх сфер грамадскага развіцця. Ранейшая сістэма, у якой дзяржава брала на сябе абавязак забяспечыць працай кожнага выпускніка вышэйшай навучальнай установы, у значнай ступені была зарыентавана на штучнае зберажэнне сацыяльных заваёў адышоўшай у гісторыю сістэмы, адной з вышэйшых каштоўнасцей якой лічылі адсутнасць беспрацоўя. Гэты палітычны падтэкст прыводзіў да наступнай сітуацыі: на практыцы далёка не заўсёды ўлічваліся інтарэсы і асобы, і грамадства. Так былі абмежаваны магчымасці актыўнага і гарманічнага самаразвіцця іх.

Дэмакратычныя пераўтварэнні ў грамадстве змянілі ўзаемаадносіны паміж спецыялістам і працадаўцам, выключылі з гэтага ланцуга дзяржаву як рэгламентуючы орган. Стрыжнёвым прынцыпам іх узаемаадносін быў прызнаны высокі прафесіяналізм спецыяліста, які адлюстроўвае агульную тэндэнцыю развіцця сучасных складаных грамадстваў, асабліва іх духоўнай сферы. Гэтая сфера выступае полем прафесійнай дзейнасці культуролага. Да найбольш важных рыс дынамікі развіцця духоўнай прасторы грамадства можна аднесці наступныя аб'ектыўныя рэальнасці: усё больш ускладнены характар чалавечых узаемаадносін; узрастанне свабоды самастойна дзеючых асоб і груп; пераход ад постіндустрыяльнага да інфармацыйнага грамадства паслуг, у якім пры дамінуючым становішчы высокіх тэхналогій, узрастаючым інфармацыйным патоку галоўнай каштоўнасцю становіцца чалавечы ракурс.

Нягледзячы на пэўную неадназначнасць і незавершанасць ідэнтычных працэсаў, якія разгортваюцца ў нашым сённяшнім грамадстве, іх дзейнасць носіць ярка акрэслены характар. Да найбольш адчувальнай праявы акрэсленых тэндэнцый у сферы культуры неабходна аднесці ўсё ўзрастаючую ступень сацыяльнай свабоды і адмаўленне ад рэгулюючага ўздзеяння ў працэсе далучэння розных груп соцыуму да агульначалавечай прасторы і яе шматграннага культурнага жыцця. Агульная пазітыўная, з пункту гледжання асабістага развіцця, накіраванасць гэтага працэсу ў той жа час высветліла і значныя негатыўныя моманты. Яны выявіліся ў фарміраванні пэўнай адчужанасці ад грамадства, у эрозіі культурных арыенціраў, зніжэнні ўзроўню культурных запатрабаванняў насельніцтва.

Акрэсленыя абставіны аб'ектыўна патрабуюць карэннага змянення падыходаў у падрыхтоўцы спецыялістаў-культуролагаў. Прыярытэтным напрамкам сённяшняй стратэгіі культурнага развіцця рэспублікі з'яўляецца не колькасны, а якасны падыход, станаўленне асобы культуролага, здольнай да свядомага вызначэння сваёй прафесійнай дзейнасці з улікам зменлівых патрабаванняў да яе змястоўнага патэнцыялу, механізмаў ажыццяўлення на практыцы. На змену культарганізатару, які галоўнай мэтай сваёй дзейнасці бачыў арганізацыю вольнага часу розных груп насельніцтва, павінен будзе прыйсці творчы кіраўнік, які пабудуе свае адносіны з аўдыторыяй на аснове прызнання унікальнасці кожнай асобы, унутранай свабоды яе ў працэсе ўспрымання культурнай рэчаіснасці, ствараць умовы для стабільнага росту духоўнага патэнцыялу кожнага грамадзяніна рэспублікі і грамадства ўвогуле. Дадзеныя якасці не ўзнікаюць самі па сабе ў гады вучобы ў вышэйшай навучальнай установе. Яны патрабуюць сістэмнага падыходу ў падрыхтоўцы будучых спецыялістаў, звязаны з фарміраваннем у студэнтаў прафесіянальнай самаідэнтыфікацыі.

Прафесійная самаідэнтыфікацыя – утварэнне, якое канцэнтруе ў сабе ўсе іншыя характарыстыкі прафесійнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

станаўлення асобы, спецыяліста. Зыходзячы з дэфініцый, дадзеных у энцыклапедычным і псіхалагічным слоўніках, можна канстатаваць, што прафесійная самаідэнтыфікацыя – працэс эмацыянальна-кагнітыўнага атаясамлення асобы з будучай прафесійнай дзейнасцю, уяўленне і адчуванне сябе актыўным суб'ектам гэтай дзейнасці.

Асноўнымі кампанентамі дадзенага псіхалагічнага ўтварэння асобы культуролага выступаюць станоўчыя зацікаўленыя адносіны студэнтаў да прафесіі, усебаковае вывучэнне яе спецыфікі, мэт і значнасці ў грамадстве, высвятленне ўмоў паспяховага ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці, усведамленне сваіх прафесійных магчымасцей і адэкватныя суадносіны сябе з канкрэтнымі прафесійнымі патрабаваннямі. З'яўляючыся важным элементам у структуры асобы, прафесійная самаідэнтыфікацыя аказвае станоўчы ўплыў на здольнасці, мысленне, памяць, пачуцці, забяспечваючы пры гэтым спрыяльныя ўмовы для самарэалізацыі асобы.

Як вынікае з прыведзеных характарыстык, фарміраванне прафесійнай самаідэнтыфікацыі грунтуецца не толькі і не столькі на засваенні пэўнай сістэмы ведаў і ўменняў, звязаных з будучай працай культуролага. Галоўным звяном тут выступае ўменне актыўна трансфармаваць атрыманыя веды з улікам зменлівых рэалій, здольнасць адмовіцца ад маральна састарэлых нормаў, уяўленняў, канцэпцый, гатоўнасць бесперапынна аднаўляць свой прафесійны багаж. Авалоданне гэтымі каштоўнымі якасцямі патрабуе актывізацыі самастойнай пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, жадання і навыкаў пранікнення ў сутнасць вывучаемых працэсаў, асэнсавання сябе актыўным суб'ектам іх развіцця.

Важным фактарам актывізацыі ўказанага працэсу выступае пазнавальны інтарэс студэнтаў, які з'яўляецца адлюстраваннем суб'ектыўна-аб'ектыўных адносін паміж асобай і навакольнай рэчаіснасцю. Праз інтарэс устанаўліваецца сувязь чалавека з аб'ектыўным светам. Але не ўсё ў навакольнай рэчаіснасці выклікае глыбокі інтарэс асобы, а толькі тое, што мае для яе каштоўнасць і значнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З пункту гледжання тэмы нашага даследавання такім аб'ектам пазнавальнага інтарэсу студэнтаў Беларускага універсітэта культуры выступае іх будучая прафесійная дзейнасць. Пашырэнне кола інтарэсаў у гэтай галіне дазваляе наблізіць студэнтаў да будучай працоўнай сферы, пашырыць іх уяўленні аб дыялектыцы і спецыфіцы працякання культурных працэсаў у грамадстве, забяспечыць псіхалагічную, тэарэтычную і пэўную практычную гатоўнасць іх да самастойнай дзейнасці.

Як сфарміраваная асобная каштоўнасць інтарэс, выяўлены ў змесце дзейнасці, што адбываецца пад яго ўплывам, выступае важнай крыніцай развіцця асобы, якая праз выбіральныя адносіны да рэчаіснасці ўзбагачае свой духоўны свет, стымулюе развіццё ўласнага творчага патэнцыялу. З'яўляючыся каштоўнай інтэграцыйнай якасцю, пазнавальны інтарэс спрыяе складванню адметнага тонусу дзейнасці і стану асобы. Гэта адлюстроўваецца ў радасці ад працэсу атрымання новых ведаў, у жаданні паглыбіць іх, суаднесці з раней набытым багажом ведаў або ў перажыванні няўдач, у пошуку іншых падыходаў да вырашэння праблемы. Але такая рэакцыя з'яўляецца наступствам не любога інтарэсу, а пэўнага ўзроўню яго развіцця: калі ад простай зацікаўленасці з'явай або прадметам чалавек пераходзіць да пранікнення ў сутнасныя сувязі гэтых з'яў, выяўляе іх шматгранныя ўзаемаадносіны і заканамернасці. Гэтая ступень развіцця інтарэсу не толькі забяспечвае ажыццяўленне пазнавальнага падыходу, але стымулюе пераўтварэнне набытага патэнцыялу ведаў у практыку сваёй дзейнасці, спрыяючы такім чынам станаўленню прафесійнай самаідэнтыфікацыі студэнтаў.

Як сведчаць даследаванні і практычны вопыт, змястоўнай і эфектыўнай формай актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў з'яўляецца арганізацыя навучальнага працэсу з выкарыстаннем элементаў методыкі "палілогу" (полі – многа, логас – паняцце, думка). Яго сутнасць заключаецца ў мадэліраванні актыўных зносін некалькіх удзельнікаў дыскусіі, погляды якіх адлюстроўваюць розныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аспекты і падыходы да вывучаемай з'явы, у прыватнасці да культуралагічнай дзейнасці. У мэтах пашырэння поля пазнавальнай дзейнасці студэнтаў і набліжэння іх тэарэтычных ведаў да дынамікі сацыякультурнай сітуацыі ў рэспубліцы трэба рацыянальна вызначаць для палілогу тыя аспекты дзейнасці культурных устаноў для арганізацыі адпачынку, якія адлюстроўваюць наватарскія падыходы і перспектыўныя накірункі іх развіцця і таму менш за іншыя вядомы студэнтам. Так, для засваення новага якаснага прызначэння ўстаноў па арганізацыі вольнага часу можна рэкамендаваць студэнтам для абмеркавання наступныя тэмы: "Клуб – каардынатар культурнага жыцця рэгіёна", "Клуб – цэнтр развіцця рэкрэацыйнай культуры грамадства", "Клуб – лабараторыя самадзейнай творчасці", "Клуб – акумулятар культурных ініцыятыў" і інш. Як сведчаць прапанаваныя тэмы, установы культуры павінны выступаць актыўнымі культурастваральнымі органамі, якія будуюць сваю дзейнасць на аснове ўспрымання і ўзбагачэння культурнай ініцыятывы мас.

Зыходзячы з абранай для абмеркавання тэмы, для стварэння больш канкрэтнай мадэлі дзейнасці культуролага неабходна вызначыць ролі асноўных удзельнікаў арганізацыі культурнага жыцця раёна. Тут павінны быць улічаны пазіцыі праграмы сацыяльнага развіцця мясцовасці, яе эканамічнага патэнцыялу, уключаючы бюджэтныя і пазабюджэтныя сродкі, патрабаванні розных узроставых груп насельніцтва і культурную стратэгію рэгіёна ўвогуле. Улічваючы спецыфіку і складанасць арганізацыі навучання на завочным факультэце, студэнтам прапаноўваюцца запісаныя на аўдыёкасетах ці надрукаваныя тэкставыя варыянты пазіцый удзельнікаў палілогу. Акрамя таго, рэкамендуецца выбраць ці самастойна сфармуляваць найбольш прадукцыйны варыянт вырашэння пастаўленай задачы, развіць ці абвергнуць прапанаваныя пункты гледжання, дапоўніць, калі ёсць, на іх погляд, такая неабходнасць, колькасць удзельнікаў дыскусіі з абгрунтаваннем іх пазіцый. Такая пастаноўка навучальных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

задач патрабуе ад студэнтаў значнага пашырэння сваіх ведаў аб будучай дзейнасці, стварае ўмовы для ўспрымання культурнай дзейнасці па арганізацыі адпачынку як шматграннага працэсу. Адначасова адбываецца перанясенне студэнтамі сябе ў поле, прастору, абставіны канкрэтнай сітуацыі, што дае магчымасць глыбока пранікнуць у сутнасць праблемы, убачыць яе як цэласную няпростую з'яву, зразумець рэальныя ўмовы ўзаемадзеяння спажыўцоў культурных даброт і арганізатараў. Складанасць сітуацыі заключаецца ў тым, што поспех у вырашэнні пастаўленай задачы не гарантуецца простым пераносам набытых раней ведаў і вопыту. Разам з актуалізацыяй патэнцыялу сітуацыя патрабуе самастойнага абагульнення ведаў, адаптацыі іх да канкрэтнай сацыякультурнай мадэлі з улікам перспектыў яе далейшага развіцця.

Асноўнай функцыяй такіх заняткаў выступае стымуляванне самастойнай разумовай дзейнасці студэнтаў, далучэнне іх да творчага вырашэння праблемы, адчуванне сябе рэальным удзельнікам культурастваральнай дзейнасці. Гэтыя ўмовы спрыяюць перарастанню вузкіх мэт і матываў дзейнасці па арганізацыі культурных мерапрыемстваў у мэты і матывы шырокай сацыяльнай значнасці, што сведчыць аб развіцці ў студэнтаў прафесійнай інтуіцыі, адпаведнага мыслення і неабходнай самаідэнтыфікацыі.

Другой часткай работы па прынцыпе палілогу выступае абмеркаванне праблемы ў час семінарскіх заняткаў. Студэнты павінны абгрунтаваць абраную пазіцыю ў працэсе дыскусіі з апанентамі. Важнейшым зыходным момантам арганізацыі дэбатаў выступае станоўчая эмацыянальна-матывацыйная сфера ўдзельнікаў дыскусіі. Гэта стварае атмасферу сумеснага творчага працэсу, спрые праяўленню асобаснага падыходу да вырашэння праблемы, раскрывае ўзровень прафесійнага самаадчування ўдзельнікаў дыскусіі. Для падвядзення вынікаў у пачатку заняткаў неабходна стварыць экспертную групу, якая павінна правесці аналіз прадстаўленых пазіцый, адзначыць найбольш цікавыя і арыгінальныя падыходы да вырашэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праблемы, вылучыць самы эфектыўны праект ажыццяўлення дзейнасці культурнай установы, падкрэсліць тыя аспекты праблемы, якія не знайшлі належнага раскрыцця ў ходзе дыскусіі. Такі шматбаковы падыход да вывучэння з'яў будучай прафесійнай дзейнасці актывізуе інтарэс індывіда да прафесіі, стымулюе далейшае набыццё ведаў і ўяўленняў аб ёй.

Яшчэ адным вынікам адзначанай формы навучальнай дзейнасці выступае магчымасць выяўлення асобных характарыстык і прафесійных якасцей студэнтаў, вылучэнне рыс, якія з пункту гледжання прафесійнай самаідэнтыфікацыі патрабуюць карэкцыі. А гэта стварае ўмовы для мэтанакіраванай дзейнасці па ўдасканаленні прафесійнага развіцця асобы студэнта. Зыходзячы з гуманістычнага падыходу ў падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў, тэхналогія палілогу дазваляе забяспечыць свабоднае развіццё асобы студэнта, максімальна ўлічыць індывідуальныя асаблівасці яго прафесійнага станаўлення, пашырыць умовы для дасягнення асобаснай і прафесійнай яго самарэалізацыі.

Як сведчыць практыка, адзначаная форма навучання становіцца магутным фактарам інтэнсіфікацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў і ўсяго навучальнага працэсу. Яна дазваляе шляхам мэтанакіраванага выхаваўчага і навучальнага ўздзеяння павысіць ініцыятыву, павялічыць імкненне студэнтаў да самастойнага пошуку, вырашэння актуальных праблем прафесійнай дзейнасці. Акрамя таго, ва ўмовах вельмі зменлівых прагнозаў развіцця грамадства палілагічная форма правядзення заняткаў дапамагае сфарміраваць у студэнтаў псіхалагічную ўстойлівасць, упэўненасць у магчымасцях на прафесійным узроўні вырашаць свае праблемы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ